# АСАБЛІВАСЦІ ПРЫМЯНЕННЯ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАГА ПАДЫХОДУ ДА НАВУЧАННЯ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

***Лапцёнак І.Б.**, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ІПКіПК установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя вектары функцыянавання дадатковай адукацыі дарослых устаноўлены на аснове стратэгій і рэкамендацый аўтарытэтных міжнародных арганізацый, камісій і форумаў. У Выніковай дэкларацыі VI Міжнароднай канферэнцыі ЮНЕСКА «CONFINTEA VI» падкрэсліваецца, што адукацыя дарослых «выконвае найважнейшую ролю ў пошуку рашэнняў сучасных праблем у галіне культуры, эканомікі, палітыкі і грамадскіх адносін», з'яўляецца «ключавым кампанентам» цэласнай сістэмы навучання і адукацыі на працягу жыцця [1, с. 106]. Паняцце «дадатковая адукацыя дарослых» у нацыянальных межах вызначана артыкулам 240 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей – Кодэкс) як «від дадатковай адукацыі, накіраваны на прафесійнае развіццё слухача, стажора і задавальненне іх пазнавальных патрэбнасцей» [3].

Асноўным суб'ектам дадатковай адукацыі дарослых (далей – ДАД) з'яўляецца дарослы навучэнец, што ў значнай ступені вызначае адметнасць арганізацыі адукацыйнага працэсу і яго навукова-метадычнае забеспячэнне. Вынікі правядзення сацыялагічных даследаванняў сведчаць аб тым, што пэўныя *асаблівасці дарослых навучэнцаў* вылучаюць іх сярод іншых катэгорый удзельнікаў адукацыйнага працэсу:

– самастойныя і самакіруемыя. І таму ім падабаецца самім планаваць сваю дзейнасць і актыўна ўдзельнічаць у працэсе навучання;

– маюць пэўны жыццёвы вопыт і веды. І таму зыходную платформу для іх навучання трэба будаваць на іх вопыце;

– арыентаваны на дасягненне пэўнай мэты. І таму іх навучанне з'яўляецца эфектыўным, калі створаны выразныя арыенціры, умовы для працы над праектамі і тэмамі, якія адлюстроўваюць іх інтарэсы;

– выказваюць запатрабаванне аб актуальнасці атрымліваемай інфармацыі. І таму неабходна адносіцца да распрацоўкі і рэалізацыі

зместу адукацыйных праграм для іх з улікам праблемных пытанняў існуючай практыкі і тэндэнцый на апярэджанне.

Эфектыўнасць сістэмы ДАД у канкрэтных абласцях прафесійнай дзейнасці звязана з неабходнасцю развіцця кадравага патэнцыялу, удасканаленнем педагагічнай практыкі ўстаноў адукацыі, метадычных распрацовак галіны. На сённяшні дзень *адукацыйныя праграмы ДАД сферы культуры рэспубліканскага ўзроўню* рэалізуюцца Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (далей – БДУКМ), а таксама на факультэтах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ўстаноў адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» і «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў». Ва ўсіх названых установах ажыццяўляецца адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, а павышэнне кваліфікацыі – у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (далей – Інстытут) і на факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту павышэнне кваліфікацыі праводзіцца ў Інстытуце і на факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, а перападрыхтоўка – толькі ў Інстытуце. Штогод павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў Інстытуце праходзяць больш за 40 % ад колькасці кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія засвоілі адукацыйныя праграмы ДАД ва ўстановах адукацыі сферы культуры: такія катэгорыі работнікаў, як кіраўнікі і спецыялісты упраўленняў культуры, клубаў, палацаў і дамоў культуры, метадычных цэнтраў народнай творчасці, бібліятэк, музеяў, арганізацый кінавідэапракату, кіраўнікі і педагагічныя работнікі дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, кіраўнікі тэатральна-відовішчных устаноў і інш.

Найбольш важная частка рэалізацыі гэтых праграм – укараненне новых падыходаў. Асноўнымі *мэтамі* ўкаранення практыка-арыентаванага падыходу з’яўляюцца: развіццё прафесійных, агульнакультурных, сацыяльна-значных кампетэнцый з дапамогай набыцця ведаў, уменняў, навыкаў і вопыту пэўнай практычнай дзейнасці, шляхам увядзення ў атмасферу прафесійнага асяроддзя, генерацыі прафесійна-арыентаваных тэхналогій згодна з запытамі і патрабаваннямі працадаўцы; стварэнне магчымасцей для распрацоўкі інавацыйных праектаў і праграм, выканання грантавых, навукова-прыкладных работ дзякуючы высокаму ўзроўню падрыхтоўкі кадраў. Улічваючы непрацяглы тэрмін навучання пры засваенні адукацыйных праграм ДАД, практычная накіраванасць іх рэалізацыі набывае асаблівую актуальнасць.

Да ліку адметных *форм выяўлення практыка-арыентаванага падыходу* ў вучэбна-метадычным забеспячэнні ДАД можна аднесці: удзел вядучых спецыялістаў-практыкаў у камісіях па абароне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыпломных работ, дзяржаўна-экзаменацыйных камісіях, навукова-даследчых работах, накіраваных на ўдасканаленне метадычнага забеспячэння галіны, варыятыўнай частцы адукацыйнага працэсу, кіраўніцтве падрыхтоўкай рэфератаў і дыпломных работ, арганізацыі сумесных культурна-адукацыйных мерапрыемстваў.

Значны элемент практыка-арыентаванага падыходу ў ДАД – *інтэграцыя з базамі практыкі.* Практыка-арыентаванае навучанне прадугледжвае наяўнасць адметных пляцовак, створаных як ва ўстанове адукацыі, так і ў арганізацыях галіны пры садзеянні ўстановы адукацыі, з мэтай вырашэння рэальных задач практычнай дзейнасці з удзелам прафесіяналаў-практыкаў.

Саарганізатарамі Інстытута ў рэалізацыі практыка-арыентаванага навучання з'яўляюцца як унутраныя партнёры (кафедры БДУКМ, галерэя «Універсітэт культуры», аддзел інфармацыйна-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Інстытута), так і знешнія партнёры (базы практык у арганізацыях, па напрамках культурнай дзейнасці). У мэтах павышэння якасці адукацыі распрацаваны пералік базавых пляцовак для правядзення выязных аўдыторных заняткаў для слухачоў, у які ўключаны 57 устаноў культуры і адукацыі. На іх базе праводзяцца практычныя заняткі, майстар-класы, трэнінгі, заняткі са слухачамі па абмену вопытам. Практычны кампанент, зафіксаваны ў адукацыйных праграмах ДАД Інстытута, складае больш за 70 % ад агульнай колькасці вучэбных гадзін.

Навучанне кіраўнікоў і спецыялістаў у сістэме ДАД паступова набывае *мабільны характар*. Работнікі музеяў асвойваюць змест адукацыйных праграм у прасторы экспазіцыйных, выставачных залаў, майстэрань, музейна-педагагічных зон Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту і інш. Практычныя заняткі для работнікаў бібліятэк праходзяць у спецыялізаваных залах і фондасховішчах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, бібліятэкі БДУКМ, Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінск і інш. Майстар-класы для работнікаў устаноў адукацыі сферы культуры арганізуюцца ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжы, Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. К. Глебава і інш. Работнікі тэатральна-відовішчных арганізацый вывучаюць вопыт работы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра і інш. Стварэнне базы практыкі ва ўстанове адукацыі – адзнака эфектыўнасці працы ўстановы, кірунак дзейнасці якой уключаны ў праграму ДАД з мэтай распаўсюджвання перадавога вопыту практычнай дзейнасці.

Важным фактарам паспяховага ўкаранення практыка-арыентаванага падыходу ў ДАД з'яўляецца прафесійная кампетэнтнасць прафесарска-выкладчыцкага складу, дзейнасць кафедры па *арганізацыі навуковых і творчых школ, лабараторый, эксперыментальных пляцовак, спецыялізаваных аўдыторый*. Напрыклад, з мэтай профільнай падтрымкі і стварэння дадатковых магчымасцей для ўдасканалення майстэрства спецыялістаў сферы культуры ў Інстытуце адкрыта этналабараторыя. У аснову прадметнай часткі яе мабільнай экспазіцыі пакладзены калекцыі народных інструментаў, побытавых рэчаў і строяў больш чым з 15 краін свету. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў слухачы засвойваюць змест адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі, навучальных курсаў, перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Культурна-адпачынкавая дзейнасць». У працэсе практычнага навучання слухачоў спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» задзейнічаны фонд спецыялізаванай аўдыторыі «Музейнае праектаванне», на аснове якой праводзіцца аналіз і дэманстрацыя музейных праектаў, адабраных па выніках рэспубліканскіх музейных конкурсаў.

Да асноўных *задач удасканалення сістэмы ДАД у сферы культуры*, заснаваных на ўліку існуючых тэндэнцый у развіцці адукацыі, сёння можна аднесці наступныя: правядзенне маркетынгавых даследаванняў па вывучэнню запатрабаванняў слухачоў і працадаўцаў; удасканаленне навукова-метадычнага, інфармацыйнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сістэмы; укараненне новых адукацыйных тэхналогій, у тым ліку дыстанцыйных форм навучання; пашырэнне маштабаў міжнароднага супрацоўніцтва. Вынікі аналізу кадравай сітуацыі на аснове дзяржаўных статыстычных назіранняў і даныя маніторынгу, якія выяўляюць патрэбнасці ў перападрыхтоўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў, сведчаць аб тым, што існуюць праблемы ў забеспячэнні галіны пэўнымі катэгорыямі спецыялістаў. Як паказвае аналіз, работнікі культурна-асветных устаноў адчуваюць патрэбу ў засваенні новых распрацовак у сферы сваёй дзейнасці (43,9%), новых тэхналогій і форм дзейнасці (41,9%), сучасных тэндэнцый развіцця культуры (29,5%), асноў маркетынгу (26,8%), інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (25,9%), псіхалогіі асобы (21,8%), менеджменту сацыякультурнай дзейнасці (19,1%), мясцовых культурных традыцый (14,6%) [4, с. 234–235].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вектары распрацоўкі і ўкаранення практыка-арыентаванага зместу праграм ДАД ў сферы культуры вызначаны перспектыўнымі напрамкамі развіцця культуры, сярод якіх інтэграцыя беларускай культуры ў сусветную; стварэнне канкурэнта-здольнага культурнага прадукту і яго сістэмная рэпрэзентацыя; распрацоўка стандартаў якасці паслуг у сферы культуры; захаванне нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый; усямерная падтрымка таленавітай моладзі ў рэалізацыі новых ідэй і творчых праектаў [5, с. 31–32]. Асновай для ўдасканалення сістэмы ДАД павінна стаць умацаванне інтэграцыі навукі, адукацыі і практычнай дзейнасці арганізацый галіны, цесная сувязь з арганізацыямі культуры рэгіёнаў, актыўнае выяўленне, сістэмнае абагульненне і распаўсюджанне перспектыўнага вопыту іх работы ў працэсе рэалізацыі адукацыйных праграм. У перыяд 2013–2017 гг. Інстытутам арганізавана выкананне 5-і навукова-даследчых работ па актуальных аспектах развіцця дадатковай адукацыі, у тым ліку па вывучэнню запатрабаванняў кадраў культуры ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы [2]. Аналітычныя матэрыялы пакладзены ў аснову фарміравання кантынгенту слухачоў, распрацоўкі зместу адукацыйных праграм, метадычных дапаможнікаў, рэкамендацый, навукова-практычных выданняў, заснаваных на абагульненні вопыту педагагічнай дзейнасці [6, 154–162].

1. Галичин, В. А. Основные характеристики и тенденции развития образования взрослых в условиях глобализации [Электронный ресурс] / В. А. Галичин. – // Век глобализации. – 2012. – № 1. – С. 104–114. – Режим доступа: https://www.socionauki.ru/journal/files/vg/2012_1/104-114.pdf – Дата доступа: 04.01.2018.

2. Изучить потребности кадров культуры в повышении квалификации и переподготовке и разработать научно-практические рекомендации по совершенствованию системы дополнительного образования взрослых : науч.-исслед. работа / ГУО «Институт культуры Беларуси». – Гос. реестр НИОКР(Т)Р. – № ГР : 20132641.

3. Кодекс Республики Беларусь об образовании. [Электронный ресурс] : 13 января 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 декабря 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 18.07.2016 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информац. Респ. Беларусь. – Минск, 2018.

4. Лапцёнак, І. Б. Перападрыхтоўка кадраў сферы культуры як перспектыўны кірунак рэалізацыі кадравай палітыкі / І. Б. Лапцёнак // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завочнай навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І. Б. Лапцёнак [і інш.]. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2015. – С. 233—239.

5. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь до 2030 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://srrb.niks.by/info/program.pdf – Дата доступа: 04.01.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Сучасная дадатковая адукацыя дарослых у сферы культуры : навукова-метадычнае забеспячэнне і павышэнне якасці адукацыі / укл.: І. Б. Лапцёнак ; рэдкал.: І. Б. Лапцёнак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2016. – 168 с.

# ФОРМИРОВАНИЕ ТВОРЧЕСКОЙ ЛИЧНОСТИ СТУДЕНТА ПОСРЕДСТВОМ СЦЕНИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

***Гутковская С.В.,*** *заведующий кафедрой хореографии, кандидат филологических наук, доцент*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Главной целью профессионального обучения в сфере культуры и искусства является воспитание творческой личности, которой свойственны духовное богатство внутреннего мира и постоянная направленность на творческое действие во внешнем мире. Творческую личность отличают нестандартность мышления, развитое воображение, вдохновение, сильная и устойчивая потребность в творчестве, упорство в доведении дела до конца. Все эти компоненты понятия «творческая личность» имеют определенные знаковые функции. Процесс обучения на специальности «Хореографическое искусство» построен так, что студенты «обязаны постоянно демонстрировать собственные достижения по специальным предметам, совершенствовать их за счет репетиций, просмотров, показов, которые формируют у творческой личности определенную ответственность за уровень собственного обучения и за качество предлагаемого ими творческого продукта публике» [2, с. 183].

Процесс формирования творческой личности студента обусловлен необходимостью овладения профессиональными компетенциями. К числу подобных компетенций в сфере хореографического искусства относятся: готовность и способность осваивать технику исполнения, выразительно-языковые средства танца как основу профессии; разучивать хореографический текст, совершенствовать технику пластической выразительности; готовность и способность генерировать новые творческие идеи, интерпретировать произведения искусства с точки зрения направления, жанра, стиля, выразительных средств создания художественного образа [3, с. 148]. Т.А. Филановская, дифференцируя профессиональные компетенции будущих хореографов, подразделяет их на художественно-исполнительские и художественно-педагогические подгруппы компетенций [3, с. 148]. Развитие художественно-исполнительских навыков осуществляется в процессе сценической деятельности.